■ Ва ўрадзе

# Залежнасць знізілася. Але недастаткова

## На рынак Расіі даводзіцца 38,2 % беларускага экспарту

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ патрабуе больш актыўнага вырашэння задач па дыверсіфікацыі экспарту і развіцці паслуг. Адпаведнае даручэнне кіраўнік урада даў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе абмяркавалі ход рэалізацыі Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця экспарту Беларусі на 2016—2020 гады.**

Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што пэўныя станоўчыя вынікі ў экспарце на гэтым этапе дасягнуты. У 2017 годзе і пачатку 2018-га экспарт упершыню з 2012 года выйшаў на траекторыю ўстойлівага росту. У студзені — лютым 2018 года ён вырас на 29,8 % да $6,185 млрд, забяспечана дадатнае знешнегандлёвае сальда ў памеры $206 млн.

Экспарт тавараў павялічыўся як за кошт росту сярэдніх цэн, так і ў фізічным выражэнні. Атрыманыя вынікі адпавядаюць параметрам, зацверджаным пяцігадовай праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. «Гэтаму садзейнічала і спрыяльная кан'юнктура на сыравінным рынку і на рынках краін — асноўных гандлёвых партнёраў. Разам з тым не ўсе задачы, прадугледжаныя нацыянальнай праграмай, вырашаны, перш за ўсё ў частцы геаграфічнай дыверсіфікацыі і развіцця экспарту паслуг», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Што датычыцца дыверсіфікацыі, то канцэнтрацыя экспарту на рынках пяці краін — асноўных гандлёвых партнёраў застаецца вышэйшай за сярэднюю. У студзені — лютым 2018 года на рынкі гэтых краін прыпадала амаль 71 % экспарту, хоць залежнасць ад рынку Расіі знізілася. У студзені — лютым 2018 года, нягледзячы на агульны рост экспарту ў Расію амаль на $200 млн, удзельная вага экспарту ў гэтую краіну склала 38,2 % (зменшылася на сем працэнтных пунктаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года).

Гаворачы аб таварнай дыверсіфікацыі на прыкладзе экспарту ў Еўрапейскі саюз, Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што Беларусь пастаўляе ў ЕС даволі вузкую гаму тавараў, значную долю (каля 50 %) займаюць прадукты нафтаперапрацоўкі. «Высокая канцэнтрацыя на рынак адной ці некалькіх краін або на вузкай гаме тавараў фарміруе для нашай краіны значныя рызыкі. Гэтыя рызыкі неабходна мінімізаваць», — падкрэсліў кіраўнік урада.

На думку прэм'ер-міністра, значны патэнцыял мае экспарт паслуг. Нацыянальнай праграмай падтрымкі і развіцця экспарту Беларусі на 2016—2020 гады ўстаноўлена, што сёлета экспарт паслуг у агульным аб'ёме павінен скласці не менш як 23 %. У 2017 годзе гэты паказчык быў на ўзроўні 21,4 %, у студзені — лютым 2018-га — толькі 19,4 %. Асноўная доля ў экспарце паслуг у 2017 годзе прыпадала на транспартныя (44,4 % ад агульнага аб'ёму). Доля камунікацыйных, камп'ютарных, інфармацыйных паслуг у экспарце склала амаль 19 %. Таму на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна абмяркоўвалася, як будуць павялічвацца аб'ёмы экспарту іншых відаў паслуг — турыстычных, адукацыйных, медыцынскіх і г. д.

Урад таксама вывучыць прапановы па стымуляванні экспарту малога і сярэдняга бізнесу. Па даручэнні Андрэя Кабякова іх падрыхтоўкай зоймуцца Міністэрства замежных спраў і Міністэрства эканомікі. «Мы маем вялікі патэнцыял па нарошчванні экспарту суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Гэты патэнцыял трэба актыўна развіваць, ён з'яўляецца адным з прыярытэтаў нацыянальнай праграмы», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Доля малога і сярэдняга бізнесу ў несыравінным экспарце тавараў у 2017 годзе склала 28,4 %, і ўрад ставіць задачу нарасціць яе да 2020 года мінімум на пяць працэнтаў. З улікам гэтага кіраўнік урада даручыў МЗС і Мінэканомікі больш актыўна прыцягваць малы і сярэдні бізнес да вырашэння задач па росце экспарту, а таксама ўнесці ва ўрад прапановы па далейшым стымуляванні экспарту малога і сярэдняга бізнесу і зняцці магчымых бар'ераў.

**Паводле БЕЛТА** ■

■ Парламенцкі дзённік

# КОДЭКСЫ І ВЫБАРЫ

## Пра гэта і не толькі — у тыднёвым аглядзе падзей у Палаце прадстаўнікоў

Дэпутаты Леанід Брыч і Анатоль Дашко пачалі работу ў выбарчых акругах і **наведалі Брэсцкі абласны радзільны дом**. Галоўны ўрач Валерый Шугай расказаў, што на святочных выхадных у раддоме з'явіліся на свет чатыры дзяўчынкі і адзін хлопчык. Дэпутаты павіншавалі матуль, а старшыня «Белай Русі» Ленінскага раёна Брэста Таццяна Аўдзяйчук уручыла сертыфікаты дзіцячага гандлёвага цэнтра.

У аўторак Наталля Гуйвік, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве, удзельнічала ў **пасяджэнні Канстытуцыйнага суда Беларусі**, на якім разглядзелі справу аб праве на судовую абарону зацікаўленых асоб у загадным вядзенні (працэдура спагнання запазычанасці). Наталля Гуйвік лічыць, што заканадаўства мае прабел у частцы забеспячэння судовай абароны іншых асоб, правы і законныя інтарэсы якіх могуць быць закрануты пастановай аб судовым загадзе. Каб яго ліквідаваць, неабходна ўнесці змены ў Грамадзянскі і Гаспадарчы працэсуальныя кодэксы Беларусі.

Дзейнасць дэпутатаў за межамі нашай краіны на гэтым тыдні адзначана шэрагам падзей. У панядзелак — аўторак у Вяліках Луках (Расія) прайшло **сумеснае пасяджэнне камісій Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі**. На ім разгледзелі пытанні распрацоўкі і рэалізацыі двухбаковых праграм і праектаў, а таксама гарманізацыі заканадаўства ў гандлёва-эканамічнай сферы. Дэпутаты сустрэліся з кіраўніцтвам Пскоўскай вобласці і горада Вялікія Лукі, а таксама наведалі завод электратэхнічнага абсталявання «ЗЭТА».

У Анкары з 10 па 12 красавіка праходзяць кансультацыі паміж Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і Камісіяй па замежных справах Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва. Бакі абмяркоўваюць развіццё міжпарламенцкіх кантактаў, **паглыбленне беларуска-турэцкага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах**.

Таксама ў гэтыя дні Валянцін Міхневіч, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па нацыянальнай бяспецы, прымае ўдзел у міжнародным назіранні за **выбарамі прэзідэнта Азербайджана** ў складзе місіі назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў па лініі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД.

**Надзея АНІСОВІЧ** ■

■ Ёсць нагода

# І ЗНОЎ ПАЕХАЛІ!

**Сёння чарговая гадавіна першага палёту чалавека ў космас. І ў той час, пакуль многія, гледзячы ў неба, успамінаюць таго быццам роднага Юрыя Гагарына, у айчынных навуковых інстытутах і на прадпрыемствах думаюць пра запуск новага беларуска-расійскага спадарожніка.**

Да 2019 года апарат знаходзіцца на этапе эскізнага праектавання. І толькі бліжэй да яго завяршэння будзе вядома, калі мы зможам запусціць новы спадарожнік у космас. Пакуль што ў нас ёсць свая «БКА» на арбіце. За гады працы — нагадаем, што запусцілі спадарожнік у 2012-м, — знята больш за 120 млн кв. км, у тым ліку шматразова сфатаграфаваная тэрыторыя нашай краіны. Планавалася, што ён пралятае пяць гадоў, але зараз тэрмін эксплуатацыі плануюць працягнуць яшчэ на тры.

Новы апарат дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі будзе мець звышвысокае раздзяленне. То-бок на здымках спадарожніка 2012 года можна разгледзець дэталі, не меншыя за два метры, а тут плануюць усталяваць оптыку, якая дазволіць вызначаць аб'екты, нават не большыя за паўметра. Распрацоўвае такую «начынку» «Пеленг». Яго апаратура за гэтыя гады была ўсталявана на пяць спадарожнікаў, у тым ліку на два расійскія «Канопус-В», запушчаныя сёлета 1 лютага. Да канца года плануецца, што на арбіту выйдуць яшчэ два «Канопусы», запушчаныя з касмадрома «Усходні» з нашай оптыкай.

Варта нагадаць, што летась завяршылася беларуска-расійская праграма «Маніторынг-СГ». Падчас яе распрацавалі шэраг практычных рашэнняў для касмічнай галіны. Напрыклад, стварылі ўнікальны праграмна-апаратны комплекс для аналізу працэсу разгару ракетных рухавікоў на самым важным і цяжкім пачатковым этапе. Акрамя таго, працавалі над гіперспектральнай і радарнай апаратурай дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, комплексам для кантролю характарыстык вугляродных і графітных матэрыялаў вузлоў ракетных рухавікоў і іншымі праектамі. Увогуле беларускі бок за чатыры гады па праграме выканаў 49 заданняў.

Дарэчы, у верасні сустрэць сапраўднага касманаўта на сталічных вуліцах больш чым магчыма. Іх будзе ў Мінску каля 150! Прынамсі, столькі запрошана на 31-ы міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў. Праграма для ўдзельнікаў — а ўсяго гэта каля 350 чалавек — прадугледжвае пасяджэнні тэхнічных секцый і выстаўку касмічных тэхналогій, таксама яны выступяць перад прадстаўнікамі беларускіх арганізацый і ВНУ.

**Надзея АНІСОВІЧ** ■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У АЛЖЫРЫ РАЗБІЎСЯ САМАЛЁТ

Самалёт ваенна-паветраных сіл Алжыра зваліўся ў раёне аэрапорта Буфарык правінцыі Бліда на поўначы Алжыра. Крушэнне адбылося ўсяго праз некалькі хвілін пасля ўзлёту. Відавочцы паведамляюць, што лайнер ляцеў на вельмі невялікай вышыні, у яго гарэў правы рухавік. На борце Іл-76 знаходзіліся 247 ваенных і дзесяць членаў экіпажа. Паводле папярэдняй інфармацыі, усе яны загінулі. **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка** ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Абдэльазізу Бутэфліку, народу гэтай краіны, а таксама родным і блізкім загінулых пры крушэнні ваеннага самалёта. *«У Рэспубліцы Беларусь з вялікім смуткам успрынялі паведамленне аб гібелі вайскоўцаў у выніку крушэння самалёта ваенна-паветраных сіл Алжыра. Гэта цяжкая страта для вашай краіны»*, — адзначаецца ў спачуванні.

### СТРАТЫ ЎЛАДАЛЬНІКАЎ КРЫПТАВАЛЮТ У ВЫНІКУ ІХ КРАДЗЯЖОЎ СКЛАДАЮЦЬ $1,36 МЛРД

Па звестках расійскага Цэнтрабанка, з пачатку года ў свеце было здзейснена больш за 20 буйных ашуканскіх схем з выкарыстаннем лічбавых фінансавых актываў. Шкода ад крадзяжоў на сусветным рынку, звязаных з крыптавалютамі (непасрэдна крадзеж або ашуканскія ICO — прыцягненне інвестыцый у лічбавых актывах), склала $1,36 млрд, паведаміла кіраўнік дэпартамента фінансавых тэхналогій Банка Расіі Аліса Мельнікава. «З пачатку 2018 года ў свеце ажыццёўлены 22 буйныя ашуканскія схемы з выкарыстаннем лічбавых фінансавых актываў. Выкрадзена каля $1,36 млрд у крыптавалюце, або $23 млн у дзень. У студзені толькі з біржы CoinCheck выведзена больш за $420 млн», — адзначыла Мельнікава, спасылаючыся на наяўную статыстыку.

### ШТОГОД НА ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАХ ПАМІРАЕ АМАЛЬ ТРЫ МІЛЬЁНЫ ЧАЛАВЕК

Каля 2,8 мільёна людзей у свеце штогод гіне на працоўных месцах, з-за гэтага штогод губляецца да 4 % глабальнага ВУП, заявіў генеральны сакратар Міжнароднай асацыяцыі сацыяльнага забеспячэння Ханс-Хорст Канкалеўскі. Па звестках асацыяцыі, вялікая частка смяротных выпадкаў на вытворчасці звязана з праблемамі са здароўем, менш за 15 % — з няшчаснымі выпадкамі. «Гэта сведчыць аб тым, што трэба ўдзяляць значна больш увагі пытанням здароўя, чым лічылася раней», — заявіў Канкалеўскі. Эксперт дадаў, што прафілактыка смерцяў на працоўных месцах павінна абапірацца на тры складнікі: бяспека, увага да стану здароўя і дабрабыт работнікаў.

### ГІПОТЭЗА ПАХОДЖАННЯ ЛЮДЗЕЙ НЕ ПАЦВЯРДЖАЕЦЦА



Навукоўцы Оксфардскага ўніверсітэта (Англія) знайшлі астанкі, якія належаць старажытнаму чалавеку, за межамі Афрыкі і Леванта. Узрост знаходкі складае каля ста тысяч гадоў. Адкрыццё не пацвярджае здагадку аб тым, што асноўная хваля міграцыі людзей з Афрыкі пачалася 60 тысяч гадоў таму. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert. Згодна з агульнапрынятай гіпотэзай, першыя Homo sapiens з'явіліся ў Афрыцы 200—400 тысяч гадоў таму. Лічыцца, што рассяленне людзей сучаснага тыпу з Чорнага кантынента пачалося 177 тысяч гадоў таму, калі яны прыйшлі на тэрыторыю Леванта, на ўсход ад Міжземнага мора. Людзі, якія жывуць цяпер у Еўразіі, Аўстраліі і Амерыцы, з'яўляюцца нашчадкамі тых, хто мігрыраваў 60 тысяч гадоў таму. Аднак нядаўнія археалагічныя знаходкі сведчаць аб тым, што Homo sapiens маглі трапіць у Еўразію яшчэ 120 тысяч гадоў таму.